**Литература**

1. ПСРЛ: в 30 т. – Т.1: Лаврентьевская летопись. – Репринтное изд. с 1908 г. – М.: Языки русской культуры, 2001. – 496 с.
2. ПСРЛ: в 30 т. – Т.2: Ипатьевская летопись. – Репринтное изд. с 1908 г. – М.: Языки русской культуры, 2001. – 648 с.
3. *Бережков Н. Г.* Хронология русского летописания / Н. Г. Бережков. – М.: АН СССР, 1963. – 378 с.
4. *Насонов А. Н.* История Русского летописания XI - начала XVIII века / А. Н. Насонов. – М.: Наука, 1969. – 555 с.


©ПГУ

# ГРУПЫ ГАРАДЗІШЧАЎ ЖАЛЕЗНАГА ВЕКУ МІЖРЭЧЧА ДЗІСНЫ І УШАЧЫ

***А. Л. КОЦ,* Д. У. ДУК**

In territory between the rivers Disna and Ushachi are founded 7 artificial groups of sites of ancient settlement. The total of the strengthened settlements in one group makes 3-4 settlements. Affirms that territory between the rivers Disna and Ushachi has been densely enough populated in the Iron Age

Ключевые слова: гарадзішча, жалезны век, днепра-дзвінская культура

У Віцебскім Падзвінні сканцэнтравана вялікая колькаць гарадзішчаў, датуемых рознымі перыядамі жалезнага веку. У большасці выпадкаў яны размяшчаюцца групамі – «гнёздамі».

«Гняздовае» групаванне ўмацаваных паселішчаў сведчыць аб родавым рассяленні насельніцтва. Мяркуецца, што на адным гарадзішчы пражывала адна патрыярхальная сям'я, а некалькі сем'яў утваралі род (2–4 гарадзішчы – «гняздо») [2, с. 80].

Паводле В. І. Шадыры, насельніцтва жалезнага веку было звязана племянной стуктурай. Плямёны размяшчаліся ў міжрэччы прытокаў Заходняй Дзвіны і Дняпра. Даследчык лічыць, што адно з такіх плямён пражывала ў міжрэччы Дзісны і Ушачы [2, с. 81]. На акрэсленай тэрыторыі можна вылучыць 8 груп гарадзішчаў:

- Кубліцкая (Кублічы, Чамярычына, Белякоўшчына, Лісічына, Селішча).
- Замошская (Замошша, Гарадок, Лесава).
- Паддубніцкая (Паддубнікі, Шчаўкуны, Старыя Зябкі, Падауты, Зароўе, Зарэчча).
- Свільская (Брыкіці, Юзэфова, Svіла І).
- Глыбоцкая (Глыбокае, Падгаі, Зарубіна).
- Запрудская (Запруддзе, Зубкі, Гараватка, Бушыкі).
- Шпакаўшчынская (Шпакоўшчына, Глінскія (Ветрына), Нача, Катушонкі).
- Субачаўская (Субачава 1, Субачава 2).

Назва групы паходзіць ад назвы найбольш даследаванага гарадзішча. Групы гарадзішчаў вылучаюцца як па крытэрыю блізкага размяшчэння адно каля аднаго, так і злучанасці воднымі сувязямі (на берагах адной ракі, або на яе прытоках). Такім чынам, некаторыя гарадзішчы размяшчаюцца на адлегласці 2–5 км, а іншыя за 10–20 км адно ад аднаго. Пры вылучэнні груп увага надзяляецца і храналагічнаму падабенству помнікаў.

Прынята лічыць, што колькасць гарадзішчаў у групе складае пераважна 2–3 [1, с. 11; 3, с. 23]. У міжрэччы Дзісны і Ушачы ў большасці груп налічваецца 3–4 гарадзішчы, ці нават 5–6.

Толькі ўскосна можна меркаваць аб стасунках паміж жыхарамі гарадзішчаў адной групы. Назіраецца падабенства матэрыяльнай культуры ў межах адной групы (прылады працы на гарадзішчах Замошша і Гарадок). Гэта сведчыць аб сувязях паміж патрыярхальнымі сем'ямі. Падабенства прылад прыцы і зброі паміж групамі (гарадзішчы Гарадок – Кублічы; Паддубнікі – Запруддзе, Кублічы) сведчыць, верагодна, аб мірных стасунках паміж радамі.




*Мал. 1.* Карта гарадзішчаў (з вылучэннем груп) міжрэчча Дзісны і Ушачы; (1-даследаваныя помнікі, 2-помнікі, якія патрабуюць удакладнення датыроўкі)

Далейшае вывучэнне гарадзішчаў і адкрыццё новых помнікаў жалезнага веку дазволіць вылучыць новыя групы і даследаваць сацыяльныя сувязі насельніцтва азначанага перыяду.


**Літаратура**

1. *Шадыра, В. І.* Беларускае Падзвінне (І тысячагоддзе н.э.). – Мінск: ДНУ "Інстытут гісторыі НАНБ", 2006. – 150 с.
2. *Шадыра, В. І.* Днепра-дзвінская супольнасць у І тыс. н.э. // Тэзісы канферэнцыі "Беларусь у сістэме трансеўрапейскіх сувязяў у І тыс н.э. – Мн. 1996. С. 80–82.
3. *Шмидт Е. А.* Племена верховьев Днепра до образования древнерусского государства. Днепро-двинские племена (VIII в. до н.э. – III в. н.э.). – М.: Прометей, 1992. – 208 с.